Пролетары ўсіх краёў злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

№ 78 (1045) | Пятніца, 4-га красавіка 1930 г.

Штодзённая газэта рабоча-сялянскай моладзі
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

Умовы падпіскі:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
Адрас канторы: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Год выданьня X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усім сэкратарам АК ЛКСМБ

У сёнешнім № газэты „Чырвоная Зьмена“ зьмешчан артыкул тав. Сталіна „Адказы колгасьнікам“. Прапануецца тэрмінова мобілізаваць актыў і кінуць у вёску для популярызацыі гэтага артыкулу. Організуйце групы агітатараў. Прыцягнеце для гэтай работы ўсе політычна вытрыманыя культурныя сілы. Сумясьціце гэта з растлумачэньнем апошніх рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і палажэньня аб новым сельска-гаспадарчым падатку.

ЦК ЛКСМБ

І. СТАЛІН. Адказы таварышам колгасьнікам

З газэт вядома, што артыкул Сталіна: «Галавакружэньне ад посьпехаў» і вядомая пастанова ЦК: «аб барацьбе са скажэньнямі партыйнай лініі ў колгасным руху» выклікалі шматлікія водгукі ў шэрагах практыкаў колгаснага руху. У сувязі з гэтым я атрымаў за апошні час шэраг лістоў ад таварышоў колгасьнікаў з патрабаваньнем адказаць на пастаўленыя там пытаньні. Мой абавязак быў адказаць на лісты ў парадку прыватнай перапіскі. Але-ж гэта аказалася немагчымым бо большая палова лістоў была атрымана без указаньня адрасу іх аўтараў. (Забыліся прыслаць адрасы). Між тым пытаньні, закранутыя ў лістох, уяўляюць сабою вялізарную політычную цікавасьць для ўсіх нашых таварышоў. Акрамя таго, зразумела, што я ня мог пакінуць без адказу і тых таварышоў, якія забылі прыслаць свае адрасы. З прычыны гэтага я апынуўся перад неабходнасьцю адказаць на лісты таварышоў колгасьнікаў адкрыта, г. зн. у друку, узяўшы з іх усе патрэбныя для справы пытаньні. Я з большай ахвотаю пайшоў на гэтую справу, што меў наконт гэтага проста рашэньне ЦК.

Першае пытаньне: У чым зьяўляецца корань памылак у сялянскім пытаньні?

Адказ: У няправільным падыходзе да серадняка. У допушчэньні гвалту ў галіне гаспадарчых адносін з серадняком. У забываньні таго, што гаспадарчая змычка з серадняцкімі масамі павінна будавацца не на аснове гвалтоўных заходаў, а на аснове згоды з серадняком, на аснове саюзу з серадняком. У забвеньні таго, што асновай колгаснага руху ў даны момант зьяўляецца саюз рабочае клясы і беднаты з серадняком супроць капіталізму наогул, супроць кулацтва ў асаблівасьці. Пакуль наступленьне вялося супроць кулацтва ў адзіным фронце з серадняком, усё ішло добра. Але калі некаторыя нашы таварышы, ап'янёныя посьпехамі, сталі няпрыкметна спаўзаць са шляху наступленьня на кулака на шлях барацьбы з серадняком, калі яны ў пагоні за высокім процантам колектывізацыі сталі прымяняць к серадняку гвалт, пазбаўляючы яго выбарчага права, «раскулачваючы» і экспропрыіруючы яго,—наступленьне стала выкрыўляцца, адзіны фронт з серадняком стаў падрывацца, і, зразумелая справа, кулак атрымаў магчымасьць спрабаваць ізноў стаць на ногі. Забыліся, што гвалт, неабходны і карысны ў справе барацьбы з нашымі клясавымі ворагамі, недапушчальны і пагубны ў адносінах да серадняка, які зьяўляецца нашым саюзьнікам. Забыліся, што кавалерыйскія наскокі, неабходныя і карысныя для вырашэньня задач вайсковага характару, няпрыгодны і пагубны пры вырашэньні задач колгаснага будаўніцтва, організуемага к таму-ж ў саюзе з серадняком. У гэтым корань памылак у сялянскім пытаньні. Вось што гаворыць Ленін наконт гаспадарчых адносін з серадняком. «Больш за ўсё мы павінны грунтавацца на тэй ісьціне, што тут мэтадамі гвалтаў па самай сутнасьці справы нічога нельга дасягнуць. Тут экономічная задача стаіць зусім інакш. Тут няма тэй верхавіны, якую можна зрэзаць, накінуўшы ўвесь фундамант, увесь будынак. Тэй верхавіны, якою ў горадзе былі капіталістыя, тут няма. „Дзейнічаць тут гвалтам, значыцца пагубіць усю справу... Няма большага глупства, як самая думка аб гвалце ў галіне гаспадарчых адносін сярэдняга селяніна». (Том 16, стар. 150-151). Далей: «націск у адносінах да сярэдняга сялянства ўяўляе сабою найвялікшую шкоду. Гэта — шматлікі, шматмільённы пласт. Нават у Эўропе, дзе ён нідзе не дасягае такое сілы, дзе гіганцкі разьвіта тэхніка і культура, гарадзкое жыцьцё, чыгунка, дзе лягчэй за ўсё было-б думаць аб гэтым—ніхто, ніводзін з самых рэволюцыйных соцыялістых ніколі не прапаноўваў гвалтоўных мер ·· носінах да сярэдняга сялянства» (Том 16, стар. 150). Здаецца, ясна.

Другое пытаньне: Якія галоўныя памылкі ў колгасным руху?

Адказ: Іх, гэтых памылак, па крайняй меры тры.

1. Парушылі ленінскі прынцып добраахвотнасьці пры пабудове колгасаў. Парушылі асноўныя паказаньні партыі і прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі аб добраахвотнасьці колгаснага будаўніцтва. Ленінізм вучыць, што сялян трэба пераводзіць на рэйкі колектыўнай гаспадаркі ў парадку добраахвотнасьці, пераканаўшы ў перавазе грамадзкай, колектыўнай гаспадаркі перад гаспадаркай індывідуальнай. Ленінізм вучыць, што пераканаць сялян у перавазе колектыўнай гаспадаркі можна толькі ў тым выпадку, калі будзе паказана ім і давездена на справе, на вопыце, што колгас лепш індывідуальнай гаспадаркі, што ён выгадней, чым індывідуальная гаспадарка, што колгас дае выхад селяніну бедняку і серадняку з убоства і беднасьці. Ленінізм вучыць, што па-за гэтымі ўмовамі колгасы ня могуць быць моцнымі. Ленінізм вучыць, што ўсякая спроба навязаць сілай колгасную гаспадарку, усякая спроба насадзіць колгасы ў парадку прымусу можа даць толькі адмоўныя вынікі, можа толькі адштурхнуць сялян ад колгаснага руху. І сапраўды, пакуль гэтае асноўнае правіла захоўвалася, колгасны рух даваў посьпех за посьпехам. Але некаторыя нашы таварышы, захмялелыя ад посьпехаў, сталі пагарджаць гэтым правілам, сталі праяўляць празьмерную шпаркасьць і ў пагоні за высокім процантам колектывізацыі пачалі насаджаць колгасы ў прымусовым парадку. Нядзіўна, што адмоўныя вынікі такой «політыкі» ня прымусілі сябе доўга чакаць. Насьпех узьнікшыя колгасы пачалі таксама шпарка таяць, як шпарка яны ўзьнікалі, а частка сялянства, якая яшчэ адносілася да колгасаў з вялізарным давер'ем, пачала адварочвацца ад іх. У гэтым першая і галоўная памылка ў колгасным руху.

Вось што гаворыць Ленін наконт добраахвотнасьці колгаснага руху: «Зараз наша задача—пераход да грамадзкай апрацоўкі зямлі, пераход да буйнай агульнай гаспадаркі. Але ніякіх прымусаў ад савецкай ўлады быць ня можа. Ніякі закон да гэтага не прымушае. Сельска-гаспадарчая комуна організоўваецца добраахвотна, пераход да грамадзкай апрацоўкі зямлі можа быць толькі добраахвотным. Ні малейшага прымусу ў гэтых адносінах з боку рабоча-сялянскага ўраду ня можа быць і законам не дапушчаецца. Калі-б хто-небудзь з вас такія прымусы наглядаў, дык вы павінны ведаць, што гэта—злоўжываньне, што гэта—парушэньне закону, якое мы ўсімі сіламі імкнемся выправіць і будзем выпраўляць». (Том 20, частка II, стар. 320). Далей: «Толькі ў тым выпадку, калі ўдасца на справе паказаць сялянам перавагу грамадзкай, колектыўнай, таварыскай, арцельнай апрацоўкі зямлі, толькі калі ўдасца дапамагчы селяніну пры дапамозе таварыскай, арцельнай гаспадаркі, тагды толькі рабочая кляса, якая трымае ў сваіх руках дзяржаўную ўладу, сапраўды пакажа селяніну сваю правату, сапраўды прыцягне на свой бок моцна і сапраўдным чынам шматмільённую сялянскую масу. Пагэтаму значэньне ўсякага роду прадпрыемстваў па садзейнічаньню таварыскаму, арцельнаму земляробству нельга пераўвялічваць. Мы маем мільёны раскіданых, распыленых у глушы вёсак паасобных гаспадарак... Толькі калі практычна на вопыце, блізкім для сялян, будзе даведзена, што пераход да таварыскага, арцельнага земляробства неабходны і магчымы, толькі тады мы ў праве будзем сказаць, што ў такой вялізарнай сялянскай краіне, як Расія, на шляху соцыялістычнага земляробства зроблен сур'ёзны крок». (Том 16. стар. 392). Нарэшце яшчэ адно месца з твораў Леніна: «заахвочваючы таварыствы ўсякага роду, а роўна сельска-гаспадарчыя комуны сярэдніх сялян, прадстаўнікі савецкай улады не павінны допушчаць аніякага прымусу пры стварэньні апошніх. Толькі тыя аб'яднаньні каштоўныя, якія праведзены самымі сялянамі па іх вольнаму пачыну і выгады якіх правераны імі на практыцы. Празьмерная пасьпешнасьць у гэтай справе шкодна таму, што ўласьціва толькі ўзмацняць прадузяты погляд сярэдняга сялянства супроць навін. Тыя працаўнікі савецкае ўлады, якія дазваляюць сабе ўжываць ня толькі просты, але хаця-б і ўскосны прымус у мэтах прылучэньня сялянства да комун, павінны падпарадкавацца найсуровейшай адказнасьці і звальненьню ад працы на весцы». (Том 16, стар. 159). Здаецца, ясна. Наўрад ці патрэбна даводзіць, што партыя будзе праводзіць гэтыя ўказаньні Леніна з усёю строгасьцю.

2. Парушылі Ленінскі прынцып посьпеху рознастайнасьці ўмоў у розных раёнах СССР у дачыненьні да колгаснага будаўніцтва. Забыліся, што ў СССР ёсьць самыя рознастайныя вобласьці з розным экономічным укладам і ўзроўнем культуры. Забыліся, што сярод гэтых вобласьцяй маюцца перадавыя, сярэднія і адсталыя вобласьці. Забыліся, што тэмпы колгаснага руху і мэтады колгаснага будаўніцтва ня могуць быць аднолькавымі для гэтых неаднолькавых вобласьцяй... «Было-б памылкова,—кажа Ленін,—калі-б таварышы проста па шаблёну сьпісвалі дэкрэты для ўсіх мясцовасьцяй Расіі, калі-б бальшавікі-комуністыя, савецкія работнікі на Украіне і на Доне пачалі без разбору, агулам распаўсюджваць іх і на другія вобласьці»... бо «мы ня звязваем сябе аднастайным шаблёнам і не рашаем раз назаўсёды, што наш вопыт, вопыт Цэнтральн. Расіі можна перанесьці цалкам на ўсе акраіны». (Том 16, стар. 106). Ленін кажа далей, што: «цэнтральную Расію, Украіну, Сібір, шаблёнізаваць, падпарадкаваць пэўнаму шаблёну, будзе найвялікшым глупствам». (Том 18, частка I, стар. 143). Нарэшце, Ленін абвязвае комуністых Каўказу, каб яны «зразумелі своеасаблівасьць сваёй рэспублікі ў адзнаку ад становішча і ўмоў РСФСР, зразумелі неабходнасьць не капіраваць нашу тактыку, а абдумана відазьмяняць яе прыстасавальна да разьвіцьця конкрэтных умоў» (том 18, ч. I, стар. 200). Здаецца, ясна. На аснове гэтых казаньняў Леніна ЦК нашай партыі ў сваёй пастанове «Аб тэмпах колектывізацыі» (гл. «Праўду» ад 6-га студзеня, 30 г.) разьбіў вобласьці СССР з пункту погляду тэмпаў колектывізацыі на тры групы, з якіх Паўночны Каўказ, Сярэдняя Волга і Ніжняя Волга могуць у асноўным скончыць колектывізацыю вясною 1931 году, іншыя зернавыя вобласьці (Украінская, ЦЧВ. Сібір, Урал, Казакстан і г. д.) могуць яе закончыць у асноўным увесну 1932 году, а астатнія вобласьці могуць расьцягнуць колектывізацыю да канца пяцігодкі, г. зн. да 1933 году. Здаецца, зразумела. А што атрымалася на справе? Атрымалася, што некаторыя нашыя таварышы, упоеныя першымі посьпехамі колгаснага руху, спакойна забылі аб указаньнях Леніна і аб пастанове ЦК. Маскоўская вобласьць у ліхаманкавай пагоні за ўздутымі лічбамі колектывізацыі пачала орыентоўваць сваіх працаўнікоў на сканчэньне колектывізацыі ўвесну 30 году, хаця яна мела ў сваім распараджэньні ня менш 3-х гадоў. (канец 32 году). Цэнтральная чорназемная вобласьць, не жадаючы «адстаць ад іншых», стала орыентоўваць сваіх працаўнікоў на сканчэньне колектывізацыі да першай паловы 1930 году, хаця яна мела ў сваім распараджэньні ня менш 2-х гадоў. (канец 1931 году), а Закаўказскі і Туркестанскі ў сваім рвеньні «дагнаць і перагнаць» перадавыя раёны сталі орыентавацца на сканчэньне колектывізацыі «у найкарацейшы тэрмін», хаця яны мелі у сваім распараджэньні цэлых чатыры гады (канец 1933 году). Зразумела, што пры такім хуткім «тэмпе» колектывізацыі раёны, менш падрыхтаваныя да колгаснага руху, у сваім рвеньні «перагнаць» раёны, больш падрыхтаваныя, аказаліся прымушанымі пусьціць у ход узмоцнены адміністрацыйны націск, імкнучыся ўзьмясьціць недастаючыя фактары хуткага тэмпу колгаснага руху сваім уласным адміністрацыйным запалам. Вынікі вядомы. Усім вядома тая неразьбярыха, якая атрымалася ў гэтых вобласьцях і якую прышлося потым распутваць у парадку ўмяшаньня ЦК. **У гэтым другая памылка ў колгасным руху.** Трэцяя. Парушылі ленінскі прынцып недапушчальнасьці пераскокваньня праз незакончаную форму руху прыстасавана да колгаснага будаўніцтва. Парушылі ленінскі прынцып—не абганяць разьвіцьцё мас, не дэкрэтаваць рух мас, не адрывацца ад мас, а рухацца разам з масамі і штурхаць іх наперад. Падводзячы іх да нашых лёзунгаў і аблягчаючы ім упэўнівацца на сваім уласным вопыце ў правільнасьці нашых лёзунгаў. «Калі Петраградзкі пролетарыят і салдаты Петраградзкага гарнізону бралі ўладу,—кажа Ленін,—яны добра ведалі, што для будаўніцтва ў вёсцы сустрэнуцца вялікія цяжкасьці, што тут трэба ісьці больш паступова, што тут імкнуцца ўводзіць дэкрэтамі, узаканеньнямі грамадзкую апрацоўку зямлі было-б найвялікшай бязглуздзіцай, што на гэта магло пайсьці нікчэмны лік сьвядомых, а вялікая большасьць сялян гэтай задачы ня ставіла. Дзеля гэтага мы абмяжоўваліся тым, што абсолютна неабходна ў інтарэсах разьвіцьця рэволюцыі: ні ў якім разе не абганяючы разьвіцьця мас, а чакаючы пакуль з уласнага вопыту гэтых мас з іх уласнай барацьбы вырасьце рух наперад» (Том XV, стар. 538-539). Выходзячы з гэтых указаньняў Леніна, ЦК у вядомай сваей пастанове «Аб тэмпе колектывізацыі» (гл. «Праўду» ад 6-га студзеня 1930 г.) прызнаў, што: а) галоўнай формай колгаснага руху ў даны момант зьяўляецца сельска-гаспадарчая арцель, што б) неабходна дзякуючы гэтаму выпрацаваць прыкладны устаў сельска-гаспадарчай арцелі, як галоўнай формы колгаснага руху, што в) нельга допушчаць у нашай практычнай працы «дэкрэтаваньня» зьверху колгаснага руху і «гульню ў колектывізацыю». Гэта значыць, што зараз мы павінны трымаць курс не на комуну, а на сельска-гаспадарчую арцель, як галоўную форму колгаснага будаўніцтва, што нельга допушчаць пераскокваньня праз сельска-гаспадарчую арцель да комуны, што нельга падмяняць масавы рух сялян у колгасы «дэкрэтаваньнем» колгасаў, «гульнёй у колгасы». Здаецца, зразумела. А што атрымалася на справе? Атрымалася, што некаторыя нашы таварышы, захмялелыя ад першых посьпехаў колгаснага руху, спакойна забыліся і аб указаньнях Леніна і аб пастанове ЦК. Замест організацыі масавага руху за сельска-гаспадарчую арцель, гэтыя таварышы пачалі «пераводзіць» сялян індывідуальнікаў проста на ўстаў комуны. Замест замацаваньня арцельнай формы руху пачалі «абагульняць» прымусовым парадкам дробнае быдла, птушку, нетаварнае малочнае быдла, жылыя пабудовы. Вынікі гэтай недапушчальнай для ленінца пасьпешнасьці вядомы зараз усім. Устойлівых комун, як правіла, зразумела, не стварылі. Але затое выпусьцілі з рук шэраг сельска-гаспадарчых арцеляй. Праўда, засталіся «добрыя» рэзолюцыі. Але які ў іх толк? **У гэтым—трэцяя памылка ў колгасным руху.**

Трэцяе пытаньне: Як маглі ўзьнікнуць гэтыя памылкі і як іх павінна выпраўляць партыя?

Адказ: Яны ўзьніклі на аснове нашых шпаркіх посьпехаў у галіне колгаснага руху. Посьпехі інагды кружаць галаву. Яны спараджаюць нярэдка празьмерную заразумеласьць і зазнайства. Гэта асабліва лёгка можа здарыцца з прадстаўнікамі партыі, якая стаіць на чале ўраду. Асабліва такой партыі, як наша партыя, слава і аўторытэт якой, амаль што няпамерны. **Тут упаўне магчымы факты комчванства, супроць якога люта змагаўся Ленін.** Тут упаўне магчыма вера ва ўсемагутнасьць дэкрэту, рэзолюцыі, распараджэньня. Тут упаўне рэальна небясьпека ператварэньня рэволюцыйных мерапрыемстваў партыі ва ўстоі, чыноўніцкае дэкрэтаваньне асобных прадстаўнікоў партыі ў тых ці іншых кутках нашай неабсяжнай краіны. Я маю на ўвазе ня толькі мясцовых працаўнікоў, але і асобных вобласьнікаў, але і асобных членаў ЦК. «Комуністычнае чванства,—кажа Ленін,—значыць тое, што чалавек, які састаіць у комуністычнай партыі і ня будучы яшчэ адтуль вычышчаны, выабражае, што ўсе задачы свае ён можа разьвязаць комуністычным дэкрэтаваньнем». (Том XVIII, ч. I. стар. 384-385). Вось на якім пункце ўзьніклі памылкі ў колгасным руху, выкрыўленьні партыйнай лініі ў справе колгаснага будаўніцтва.

У чым-жа небясьпека гэтых памылак і скрыўленьняў, калі яны будуць працягвацца і наперад, калі яны ня будуць ліквідаваны хутка і без астатку? Небясьпека тут у тым, што яны, гэтыя памылкі, вядуць нас простымі зносінамі да раздробленьня колгаснага руху, да разладу з серадняком, да дэзорганізацыі беднаты, замяшаньню нашых шэрагаў, да паслабленьня ўсяго нашага соцыялістычнага будаўніцтва, да аднаўленьня кулацтва. Кажучы коратка, гэтыя памылкі маюць тэндэнцыю штурхнуць нас са шляху ўмацаваньня саюзу з асноўнымі масамі сялянства, са шляху ўмацаваньня пролетарскай дыктатуры на шлях разрыву з гэтымі масамі, на шлях падрыву пролетарскай дыктатуры. Небясьпека гэта абазначылася ўжо ў другой палове лютага, у той самы момант, калі адна частка нашых таварышоў, асьлепленая ранейшымі посьпехамі, галёпам неслася ў бок ад ленінскага шляху. ЦК партыі ўлічыў гэтую небясьпеку і не замарудзіў умяшацца ў справу, даручыўшы Сталіну даць зарваўшымся таварышом папярэджаньне артыкулам аб колгасным руху. Іншыя думаюць, што артыкул «Галавакружэньне ад посьпехаў» уяўляе вынік асабовага пачыну Сталіна. Гэта, зразумела, глупства. Не для таго у нас існуе ЦК, каб допушчаць у такой справе асабісты пачын каго-б там ні было. Гэта была глыбокая разьведка ЦК. І калі высьвілілася глыбіня і разьмеры памылак, ЦК не замарудзіў ударыць па памылках усёй сілай свайго аўтарытэту, апублікаваўшы сваю славутую пастанову ад 15-га сакавіка, 30 году. Цяжка спыніць у часе шалёнага бегу і павярнуць на правільны шлях людзей, якія нясуцца ў бяздоньне. Але наш ЦК таму і называецца Цэнтральным Камітэтам Ленінскай Партыі, што ён умее перамагаць не такія цяжкасьці. І ён перамог усе гэтыя цяжкасьці ў асноўным. Цяжка спыніць у такіх выпадках свой бег цэлым атрадам партыі, у час павярнуць на правільны шлях і перабудаваць свае шэрагі на хаду. Але наша партыя таму і называецца партыяй Леніна, што яна ўладае дастатковай гібкасьцю для перамогі такіх цяжкасьцяй. І яна ўжо перамагла ў асноўным гэтыя цяжкасьці. Галоўная справа тут у тым, каб праявіць мужнасьць, прызнаць свае памылкі і знайсьці ў сябе сілы ліквідаваць іх у найхутчэйшы тэрмін. Баязьнь прызнаць свае памылкі пасьля ўпаеньня нядаўнымі посьпехамі, баязьнь самакрытыкі, нежаданьне выправіць памылкі хутка і рашуча,—у гэтым галоўная цяжкасьць. Варта перамагчы гэтую цяжкасьць, варта адкінуць далоў раздутыя лічбовыя заданьні і канцэлярска-бюрократычны - максымалізм, варта пераключыць сваю ўвагу на задачы організацыйна - гаспадарчага будаўніцтва колгасаў, каб ад памылак не засталося і сьледу. Няма ніякіх падстаў сумнявацца у тым, што партыя ўжо перамагла ў асноўным гэтую небясьпечную цяжкасьць. Усе рэволюцыйныя партыі, — кажа Ленін, — якія дагэтуль гінулі, гінулі ад таго, што не прадбачылі і ня ўмелі бачыць у чым сіла, баяліся гаварыць

(Працяг чытай на 2-й стар.)

І. СТАЛІН. Адказы таварышам колгасьнікам

(Працяг. Пачатак чытай на 1-ай старонцы)

аб сваіх слабасьцях. А мы не загінем, таму што не баімся гаварыць аб сваіх слабасьцях і навучымся перамагаць слабасьці». (Том 18, ч. 2, ст. 59.). Гэтых слоў Леніна забываць нельга.

Чацьвертае пытаньне. Ці ня ёсьць барацьба са скрыўленьнямі партыйнай лініі ход назад, адступленьне?

Адказ. Бязумоўна, не. Аб адступленьні могуць тут гаварыць толькі людзі, якія лічаць працяг памылак і скрыўленьняў наступленьнем, а барацьбу з памылкамі — адступленьнем. Наступленьне ў парадку награмаджэньня памылак і скрыўленьняў, — няма чаго гаварыць, добрае «наступленьне»... Мы высунулі сельска-гаспадарчую арцель, як асноўную форму колгаснага руху ў сучасны момант, даўшы адпаведны прыкладны статут, як кіраўніцтва да работы па колгаснаму будаўніцтву. Ці адступаем мы ад гэтай справы? Бязумоўна, не. Мы высунулі ўмацаваньне вытворчай змычкі рабочае клясы і бедната з серадняком, як асновы колгаснага руху ў сучасны момант. Ці адступаем мы ад гэтае справы? Бязумоўна, не. Мы высунулі лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, як галоўны лёзунг нашай практычнай работы ў вёсцы ў даны момант. Ці адступаем мы ад гэтай справы? Бязумоўна, не. Мы ўзялі яшчэ ў студзені 1930 году вядомы тэмп колектывізацыі сельскай гаспадаркі СССР, разьбіць вобласьці СССР на пэўныя групы і вызначыць для кожнай групы свой асобны тэмп. Ці адступаем мы ад гэтай справы? Бязумоўна, не. Дзе-ж тут «адступленьне» партыі? Мы хочам, каб людзі, якія дапусьцілі памылкі і скрыўленьні, адступілі ад сваіх памылак. Мы хочам, каб галавацяпы адступілі ад свайго галавацяпства на пазыцыі ленінізму. Мы хочам гэтага, бо толькі пры гэтай умове можна будзе працягваць сапраўднае наступленьне на нашых клясавых ворагаў. Ці значыць гэта, што мы робім гэтым ход назад? Бязумоўна, не! Гэта значыць толькі тое, што мы хочам весьці правільнае наступленьне, а не галавацяпскую гульню ў наступленьне. Ці-ж ня ясна, што толькі чудакі і «левыя» загібшчыкі могуць расцэньваць такую ўстаноўку партыі, як адступленьне? Людзі, якія балбочуць аб адступленьні, не разумеюць прынамсі дзьвюх рэчаў: 1) Яны ня ведаюць законаў наступленьня, яны не разумеюць, што наступленьне без замацаваньня заваяваных позыцый, ёсьць наступленьне, якое кінута на правал. Калі можа быць наступленьне пасьпяховым, скажам, у галіне вайсковай справы? Калі людзі не абмяжоўваюцца агульным прасоўваньнем наперад, а стараюцца разам з тым замацаваць захопленыя позыцыі, перагрупаваць свае сілы дапасавальна да зьмяніўшайся пастаноўкі, падцягнуць сілу ў тыл, падвесьці рэзэрвы. Для чаго ўсё гэта патрэбна? Для таго, каб гарантаваць сябе ад нечаканасьцяй, ліквідаваць асобныя прарывы, ад якіх не гарантавана ні адно наступленьне, і падрыхтаваць такім чынам поўную ліквідацыю ворага. Памылка польскіх войск у 1920 годзе, калі ўзяць толькі ваенны бок справы, зьяўляецца ў тым, што яны пагрэбавалі гэтым правілам. Гэтым, паміж іншым, і тлумачыцца, што, дакаціўшыся агулам да Кіева, яны прымушаны былі пасьля таксама агулам адкаціцца да Варшавы. Памылка савецкіх войск у 1920 годзе, калі ўзяць ізноў-такі толькі ваенны бок справы, зьяўляецца ў тым, што яны паўтарылі памылку палякаў пры сваім наступленьні на Варшаву. Тое-ж самае трэба сказаць аб законах наступленьня на фронце клясавай барацьбы. Нельга весьці пасьпяховае наступленьне на прадмет ліквідацыі клясавых ворагаў, не замацоўваючы заваяваных позыцый, не перагрупоўваючы свае сілы, не забясьпечваючы фронт рэзэрвамі, не падцягваючы тылы і г. д. Але справа ў тым, што галавацяпы не разумеюць законаў наступленьня. Уся справа ў тым, што партыя іх разумее і праводзіць у жыцьцё. 2) Яны не разумеюць клясавай прыроды наступленьня. Крычаць аб наступленьні. Аб наступленьні на якую клясу, у саюзе з якою клясай? Мы вядзем наступленьне на капіталістычныя элемэнты вёскі ў саюзе з серадняком, бо толькі такое наступленьне можа даць нам перамогу. Але як быць, калі ў запале захапленьня асобных атрадаў партыі, наступленьне пачынае выходзіць з правільнага шляху і паварачваецца сваім жалам супроць нашага саюзьніка, супроць серадняка? Ці-ж нам патрэбна ўсялякае наступленьне, а не наступленьне на пэўную клясу, у саюзе з пэўнай клясай? Дон-Кіхот таксама-ж уяўляў, што ён наступае на ворагаў, вядучы атаку на млын. Аднак, вядома, што ён разьбіў сабе лоб на гэтым, з дазваленьня сказаць, наступленьні. Мабыць, лаўры Дон-Кіхота не даюць спаць нашым «левым» загібшчыкам.

Пятае пытаньне: Якая ў нас галоўная небясьпека—правая, альбо «левая»?

Адказ. Галоўная небясьпека ў нас правая. Правая небясьпека была ў нас і застаецца галоўнай небясьпекай. Ці не супярэчыць гэтае палажэньне вядомаму тэзісу ў пастанове ЦК ад 15 сакавіка 1930 г., аб тым, што памылкі скрыўленьня «левых» загібшчыкаў зьяўляюцца цяпер галоўным тормазам колгаснага руху? Не, не супярэчыць. Справа ў тым, што памылкі «левых» загібшчыкаў у галіне колгаснага руху зьяўляюцца такімі памылкамі, якія ствараюць спрыяючыя ўмовы для ўзмацненьня і ўсіленьня правага ўхілу партыі. Чаму?—Таму, што гэтыя памылкі паказваюць лінію партыі ў адваротным асьвятленьні, стала быць, яны палягчаюць справу дыскрэдытацыі партыі, а значыць, яны палягчаюць барацьбу з правым элемэнтам супроць кіраўніцтва партыі. Дыскрэдытацыя партыйнага кіраўніцтва ёсьць тая самая элемэнтарная глеба, на базе якой толькі і можа разыграцца барацьба правых ухілістых супроць партыі. Гэтую глебу даюць правым ухілістым «левыя» загібшчыкі, і памылкі, і выкрыўленьні. Таму, каб змагацца з посьпехам з правым опортунізмам, трэба перамагчы спробы «левых» опортуністых. «Левыя» загібшчыкі зьяўляюцца об'ектыўна саюзьнікамі правых ухілістых. Вось тая своеасаблівая сувязь паміж «левым» опортунізмам і правым ухілізмам. Гэтай сувязьзю і трэба тлумачыць той факт, што некаторыя «левыя» часьценька пагаварваюць аб блёку з правымі. Гэтымжа трэба тлумачыць і тое своеасабліваe зьявішча, што адна частка «левакоў», сьціраючы ўсё «праводзіўшаеся» наступленьне і спрабаваўшая колектывізаваць СССР у якіх небудзь два-тры тыдні, сёньня падае, пасыўна апускае рукі і спакойна ўступае поле барацьбы правым ухілістым, вядучы такім чынам, лінію на сапраўднае адступленьне (бяз двухкосьсяў) перад кулацтвам. Асаблівасьць перажываемага моманту выражаецца ў тым, што барацьба са спробамі «левых» загібшчыкаў зьяўляецца ў нас умовай і своеасаблівай формай пасьпяховай барацьбы з правым опортунізмам.

Шостае пытаньне: Як расцэньваць адліў аднэй часткі сялян з колгасаў?

Адказ. Адліў аднэй часткі сялян азначае, што за апошнія часы нарадзілася ў нас некаторая колькасьць неўмацаваных колгасаў, якія ачышчаюцца зараз ад няўстойлівых элемэнтаў. Гэта значыць, што дутыя колгасы зьнікнуць, моцныя застануцца і будуць расьці. Я думаю, што гэта—упаўне нармальнае зьявішча. Некаторыя таварышы прыходзяць ад гэтага ў адчай, упадаюць у паніку і сударгліва хапаюцца за раздутыя проценты. Другія зларадствуюць і прарочаць «правал» колгаснага руху. І тыя і іншыя жорстка памыляюцца. І тыя і іншыя далёкі ад марксысцкага разуменьня сутнасьці колгаснага руху. Выходзяць з колгасаў перш за ўсё так званыя мёртвыя душы. Гэта нават ня выхад, а выкрыцьцё пустаты. Ці патрэбны нам мёртвыя душы? Бязумоўна не патрэбны. Я думаю, што паўночна-каўказцы і украінцы паступаюць зусім правільна, калі яны распускаюць колгасы з мёртвымі душамі, і організоўваюць сапраўды жывыя і сапраўды ўстойлівыя колгасы. Ад гэтага толькі выйгрывае колгасны рух. Выходзяць, па-другое, элемэнты чужыя, проста варожыя нашай справе. Зразумела, што чым хутчэй будуць выкінуты такія элемэнты, тым лепш для колгаснага руху. Выходзяць, нарэшце, элемэнты якія хістаюцца, якіх нельга назваць ні чуждымі, ні мёртвымі душамі. Гэта тыя самыя сяляне, якіх мы яшчэ не змаглі пераканаць сёньня ў праваце нашае справы, але якіх мы яшчэ напэўна пераканаем заўтра. Выхад такіх сялян прадстаўляе сур'ёзны, хаця і часовы вурок для колгаснага руху. Дзеля гэтага, барацьба за хістаючыяся элемэнты ў колгасах зьяўляецца цяпер аднэй з самых насушчных задач колгаснага руху. Выходзіць, што адліў аднэй часткі сялян ад колгасаў прадстаўляе ня толькі адмоўнае зьявішча. Выходзіць, што, паколькі гэты адліў вызваляе колгасы ад мёртвых душ і проста чужых элемэнтаў, ён азначае спрыяючы процант аздараўленьня і ўмацаваньня колгасаў. Месяц назад лічылі, што мы маем звыш 60 проц. колектывізацыі па зернавых вобласьцях. Зараз ясна, што калі мець на ўвазе сапраўдныя і колькі-небудзь устойлівыя колгасы, гэтая лічба была яўна перавялічана. Калі колгасны рух замацуецца пасьля адліву аднэй часткі сялян на лічбе 40 проц. колектывізацыі па зернавых вобласьцях—а гэта ажыцьцявіма напэўна,—дык гэта будзе найвялікшым дасягненьнем колгаснага руху ў даны момант. Я бяру сярэднюю лічбу для зернавых вобласьцяй, добра ведаючы, што ў нас маюцца пры гэтым асобныя раёны суцэльнай колектывізацыі з лічбай 80—90 проц. 40 проц. колектывізацыі па зернавых вобласьцях—гэта значыць, што першапачатковы пяцігадовы плян колектывізацыі мы здолелі выканаць к вясьне 1930 г. ўдвая. Хто адважыцца адмаўляць рашаючы характар гэтага гістарычнага дасягненьня ў справе соцыялістычнага разьвіцьця СССР?

Семае пытаньне: Ці добра робяць хістаючыяся сяляне, выходзячы з колгасаў?

Адказ: Не, яны робяць нядобра. Выходзячы з колгасаў, яны ідуць супроць сваіх-жа ўласных інтарэсаў, бо толькі калгасы даюць сялянам выхад з беднасьці і цемры. Выходзячы з колгасаў, яны ставяць сябе ў больш дрэннае становішча, бо пазбаўляюць сябе ўсіх ільгот і выгад, якія дае колгасам савецкая ўлада. Памылкі і выкрыўленьні ў колгасах—ня повад для выхаду. Памылкі трэба выпраўляць агульнымі сіламі, застаючыся ў колгасе. Іх тым лягчэй выправіць, што савецкая ўлада будзе ўсімі сіламі змагацца з імі. Ленін гаворыць, што: «сыстэма дробнай гаспадаркі пры таварнай вытворчасьці ня мае магчымасьці пазбавіць чалавецтва ад беднасьці мас». (Том XIV, ч. I, стар. 49).

Ленін гаворыць, што: «дробным гаспадаркам з беднасьці ня высьці». (Том XVI, стар. 378). Ленін гаворыць, што: «калі мы будзем сядзець па-старому ў дробных гаспадарках, хаця і вольныя грамадзяне, на вольнай зямлі, нам усё роўна пагражае нямінучая пагібель». (Том XIV, ч. I, стар. 159). Ленін гаворыць, што: «толькі пры дапамозе агульнай, арцельнай, таварыскай працы можна высьці з тупіка, у які загнала нас імпэрыялістычная вайна» (Том XVI, стар. 375). Ленін гаворыць, што: «неабходна перайсьці да апрацоўкі ў буйных вузорных гаспадарках, бо бяз гэтага выйсьці з той разрухі, з таго проста такі адчайнага становішча, у якім знаходзіцца Расія, нельга» (т. XIV, ч. I, стар. 159). Што ўсё гэта азначае? Гэта азначае, што колгасы зьяўляюцца адзіным сродкам, які дае сялянам магчымасьць выйсьці з беднасьці і цемры. Зразумела, што сяляне паступаюць няправільна, выходзячы з колгасаў. Ленін гаворыць, што: «савецкая ўлада прыдае вялізарнае значэньне комунам, арцелям і ўсякім наогул організацыям, накіраваным да перетварэньня, паступоваму садзейнічаньню гэтаму перетварэньню дробнай, індывідуальнай гаспадаркі ў грамадзкае, таварыскае, альбо арцельнае». (Т. XV стар. 391). Ленін гаворыць, што: «савецкая ўлада дала простую перавагу, комунам і таварыствам, паставіўшы іх на першае месца (т. XV, стар. 618). Што гэта значыць? Гэта значыць, што савецкая ўлада будзе аказваць колгасам ільготы і перавагу перад індывідуальнымі гаспадаркамі. Гэта значыць, што яна будзе аказваць колгасам ільготы і ў сэнсе прадстаўленьня зямлі, і ў сэнсе забясьпечаньня машынамі, трактарамі, насенным зернем і г. д., і ў сэнсе аблягчэньня падатковага абкладаньня, і ў сэнсе прадстаўленьня крэдытаў. Чаму савецкая ўлада аказвае ільготы і перавагу колгасам? Таму, што колгас зьяўляецца адзіным сродкам пазбаўленьня сялян ад беднасьці. Таму, што перавага дапамога колгасам зьяўляецца найбольш сапраўднай формай дапамогі бедноце і серадня кам. Гэтымі днямі савецкая ўлада вырашыла вызваліць ад падатковага абкладаньня на два гады ўсю абгрoмаджаную рабочую жывёлу ў колгасах (коняй, валоў і г. д.), усіх кароў, сьвіней, авец і птушку, якая знаходзіцца, як у распараджэньні колгасаў, так і ў індывідуальным карыстаньні колгасьнікаў. Савецкая ўлада вырашыла, акрамя таго, адтэрмінаваць да канца году пакрыцьцё запазычанасьці колгасьнікаў па крэдытах і зьняць усе штрафы і судовыя ўзысканьні, наложаныя да 1-га сакавіка на сялян, увайшоўшых у колгасы. Яна вырашыла, нарэшце, абавязкова ажыцьцявіць крэдытаваньне колгасаў у гэтым годзе ў памеры 500 мільёнаў рублёў. Гэтыя ільготы пойдуць на дапамогу сялянам—колгасьнікам. Гэтыя ільготы пойдуць на дапамогу тым сялянам—колгасьнікам, якія здолелі ўстаяць перад адлівам, якія загартаваліся ў барацьбе з ворагамі колгасаў, якія адстаялі колгасы і трымалі ў сваіх руках вялікі сьцяг колгаснага руху. Гэтыя ільготы пойдуць на дапамогу тым беднякам і серадням колгасьнікам, якія складаюць зараз асноўнае ядро нашых колгасаў, якія замацуюць і аформяць нашы колгасы і якія заваююць на бок соцыялізму мільёны і мільёны сялянства. Гэтыя ільготы пойдуць на дапамогу тым сялянам-колгасьнікам, якія складаюць зараз асноўныя кадры колгасаў і якія ўпаўне заслугоўваюць таго, каб назваць іх героямі колгаснага руху. Гэтых ільгот не атрымаюць сяляне, якія вышлі з колгасаў. Ці-ж не зразумела, што сяляне дапускаюць памылку, выходзячы з колгасаў. Ці-ж не зразумела, што толькі зваротам у колгасы могуць яны забясьпечыць сабе атрыманьне гэтых ільгот?

Восьмае пытаньне. Як быць з комунамі, ці ня варта іх распусьціць?

Адказ: Не, не патрэбна і няма на што іх распускаць. Я гавару аб сапраўдных, а не папяровых комунах. У зярнёвых вобласьцях СССР існуе шэрагі надзвычайна добрых комун, якія заслугоўваюць таго, каб іх пашыраць і падтрымоўваць іх. Я маю на ўвазе старыя комуны, якія вытрымалі вотум іспытаў і загартаваліся ў барацьбе, цалкам апраўдаўшы сваё існаваньне. Што датычыцца новых комун, якія нядаўна толькі стварыліся, дык яны змогуць адстаяць сваё існаваньне толькі ў тым выпадку, калі яны організаваліся добраахвотна пры актыўным падтрыманьні сялян, без прымусовага абграмаджаньня быту. Стварэньне і вядзеньне комун—справа складаная і цяжкая. Буйныя і ўстойлівыя комуны могуць існаваць і расьці толькі пры наяўнасьці вопытных кадраў, добрых кіраўнікоў. Скорапаліцельны перавод уставу арцелі на ўстаў комуны можа толькі адштурнуць сялян ад колгаснага руху. Таму да гэтай справы трэба адносіцца з асаблівай сур'ёзнасьцю і без якой-бы там ні было пасьпешнасьці. Арцель—больш лёгкая справа і больш даступна сьвядомасьці шырокіх сялянскіх мас. Па-гэтаму арцель зьяўляецца ў даны момант найбольш распаўсюджанай формай колгаснага руху. Толькі па меры ўзмацненьня і ўмацаваньня сельскагаспадарчых арцеляў можа стварыцца глеба для масавага руху сялян у бок комуны. Дзеля гэтага комуна, уяўляючая вузкую форму, можа стаць галоўным зьвяном колгаснага руху толькі ў будучыні.

Дзевятае пытаньне: Як быць з кулацтвам?

Адказ. Да гэтага часу гутарка ішла ў нас аб серадняку. Серадняк-жа саюзьнік рабочае клясы, і політыка ў нас павінна быць з ім таварыскай, іншая справа—кулак. Кулак ёсьць вораг савецкай ўлады. З ім у нас няма і ня можа быць згоды. Наша політыка ў адносінах да кулацтва, ёсьць політыка яго ліквідацыі, як клясы, гэта зразумела ня значыць, што мы можам яго ліквідаваць у адзін прыём. Але гэта значыць, што мы будзем весьці справу на тое, каб абкружыць яго і ліквідаваць. Вось што кажа Ленін пра кулака: «кулакі—самыя зьверскія, самыя грубыя, самыя лютыя эксплёататары, якія ня раз аднаўлялі ў гісторыі іншых краін уладу абшарнікаў, цароў, папоў, капіталістых. Кулакоў больш чымся абшарнікаў і капіталістых. Але ўсё-ж т'кі кулакі—меншасьць у народзе... Гэтыя крывапійцы нажыліся, на народным убостве ў часе вайны, яны сабралі тысячы і сотні тысяч грошай, павышаючы цэны на хлеб і іншыя продукты. Гэтыя павукі тлусьцелі за лік зруйнаваных вайною сялян, за лік галодных рабочых. Гэтыя п'яўкі пілі кроў працоўных, багацеючы тым больш, чым больш галадаў рабочы ў гарадох і на фабрыках. Гэтыя вампіры, падбіралі і падбіраюць сабе ў рукі землі абшарнікаў, яны ізноў закабальваюць бедных сялян». (Том XX, ч. 2-я, стар. 257). Мы цярпелі гэтых крывапійцаў, павукоў і вампіраў, праводзячы політыку абмяжаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый. Цярпелі, бо ня было чым замяніць кулацкую гаспадарку, кулацкую вытворчасьць. Зараз мы маем магчымасьць замяніць іх гаспадарку гаспадаркай нашых колгасаў і саўгасаў. Цярпець далей ад гэтых павукоў і крывапійцаў няма патрэбы. Цярпець далей гэтых павукоў і крывапійцаў, якія падпальваюць колгасы, забіваюць колгаскіх дзеячоў і стараюцца сарваць сяўбу, значыць ісьці супроць інтарэсаў рабочых і сялян. Дзеля гэтага політыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, павінна праводзіцца з ўсёй настойлівасьцю і пасьлядоўнасьцю, на якую толькі здольны бальшавікі.

Дзесятае пытаньне: У чым бліжэйшая практычная задача колгасаў?

Адказ: Бліжэйшая практычная задача колгасаў месьціцца ў барацьбе за сяўбу, у барацьбе за найбольшае пашырэньне пасяўных плошчаў, у барцьбе за правільную організацыю севу. Да задачы сяўбы павінны быць прыстасаваны зараз усе іншыя задачы колгасаў. Працы па організацыі сяўбы павінны быць падпарадкаваны зараз усе іншыя работы ў колгасе. Гэта значыць, што ўстойлівасьць колгасу і іх беспартыйнага актыву, здольнасьць кіраўнікоў колгасаў і бальшавіцкага ядра будуць правярацца не на траскучых рэзолюцыях і шырокавяшчальных прывітаньнях, а на жывой справе правільнай організацыі сяўбы. Але каб ажыцьцявіць з гонарам гэту практычную задачу, трэба зьвярнуць увагу колгасных працаўнікоў у бок гаспадарчых пытаньняў колгаснага будаўніцтва, у бок пытаньняў унутрыколгаснага будаўніцтва. Да апошняга часу у цэнтры ўвагі колгасных працаўнікоў стаяла пагоня за высокімі лічбамі колектывізацыі, прычым людзі не жадалі бачыць розьніцы паміж сапраўднай колектывізацыяй і колектывізацыяй папяровай. Зараз гэта захапленьне лічбамі павінна быць адкінута далоў. Цяпер увага прадстаўнікоў павінна быць сконцэнтравана на замацаваньні колгасаў, на організацыйным аформленьні колгасаў, на організацыі дзелавой работы ў колгасах. Да апошняга часу ўвага колгасных працаўнікоў была сконцэнтравана на організацыі буйных колгасных адзінак, на організацыі так званых «гігантаў», прычым «гіганты» ня рэдка вырастаюць у грамозныя папяровыя комэндатуры, якія пазбаўлены гаспадарчых карэньняў у вёсках і сёлах. Паказальная праца паглынала, стала быць, работу дзелавую. Цяпер гэтае захапленьне паказальным бокам павінна быць адкінута прэч. Цяпер увага працаўнікоў павінна быць завострана на організацыйна-гаспадарчай працы колгасаў у вёсках і сёлах. Калі гэта праца пакажа належныя посьпехі, «гіганты» зьявяцца самі сабою. Да апошняга часу на прыцягненьне серадняков да кіраўнічай працы ў колгасах зьвярталася мала ўвагі. Між тым сярод серадняков ёсьць добрыя гаспадары якія маглі-б стаць дасканальнымі гаспадарчымі працаўнікамі колгаснага будаўніцтва. Цяпер гэты недахоп у нашай працы павінен быць ліквідаваны. Цяпер задача састаіць у тым, каб прыцягнуць да кіраўнічай работы ў колгасы лепшых людзей, серадняков і даць ім разгарнуць на гэтай справе свае здольнасьці. Да апошняга часу не зьвярталі дастатковай ўвагі на працу сярод сялянак. Мінулы пэрыод паказаў, што праца сярод сялянак зьяўляецца ў нас найбольш слабым месцам нашай працы. Зараз гэты недахоп павінен быць ліквідаваны рашуча і беспаваротна. Да апошняга часу комуністыя шэрагу раёнаў выходзілі з таго, што яны могуць разьвязаць сваімі ўласнымі сіламі задачы колгаснага будаўніцтва. Выходзячы з гэтага, яны не зьвярталі дастатковай ўвагі на прыцягненьне беспартыйных да адказнай працы ў колгасах, на вылучэньне беспартыйных на кіраўнічую працу колгасам, на організацыю ў колгасах шырокага беспартыйнага актыву, гісторыя нашай партыі паказала, за мінулы пэрыод колгаснага будаўніцтва лішні раз якая ўстаноўка зьяўляецца ў корні няправільнай. Калі-б комуністыя замыкаліся ў сваю шкарлупу, адгараджваліся сьцяной ад беспартыйных, яны-б загубілі ўсю справу. Калі комуністым удавалася пакрыць сябе славай у баёх за соцыялізм, а ворагі комунізму аказваліся разьбітымі, дык гэта, паміж іншым, таму, што комуністыя ўмелі прыцягваць да справы лепшых людзей беспартыйных, яны ўмелі чэрпаць сілы сярод шырокіх слаёў беспартыйных, яны ўмелі абкружаць сваю партыю шырокім беспартыйным актывам. Цяпер гэты недахоп нашай працы з беспартыйнымі павінен быць ліквідаваны рашуча і беспаваротна. Выправіць гэтыя недахопы нашай працы, ліквідаваць іх у корні, гэта менавіта значыць паставіць на рэйкі гаспадарчую работу колгасу. Ітак 1) Правільная організацыя сяўбы,—такая задача. 2) Сконцэнтраваньне ўвагі на гаспадарчых пытаньнях колгаснага будаўніцтва,—такі сродак, неабходны для разьвязаньня гэтай задачы

Баявы агляд падрыхтаванасьці да сяўбы

Кінем усе сілы на баявое правядзеньне сяўбы

Накіруем усю энэргію і ініцыятыву комсамолу на організацыю і правядзеньне вопытных праверак падрыхтаванасьці да сяўбы і замацаваньне організаваных колгасаў

КОЛГАСНАЯ ВЯСНА ПАТРАБУЕ КОНКРЭТНАЙ ЖЫВОЙ СПРАВЫ АД КОЖНАЙ КОМСАМОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙКІ

„МАЯК СОЦЫЯЛІЗМУ"—РАПАРТУЕ

Прывітальная тэлеграма сэкратару ЦК КП(б)Б т. ГЕЮ

Мы колгасьнікі Барысаўскага прыгараднага колгасу „Маяк Соцыялізму" ў ліку 150 сем'яў, абагуліўшы насеньне, коні і інвэнтар на 100 проц., продукцыйную малочную жывёлу на 97 проц.,—у дзень пробнага выезду ў поле запэўніваем вас і ЦК КП(б)Б, што ў адказ на вылазку папы рымскага і кулацка-варожых элемэнтаў унутры нашай краіны,—мы загад комуністычнай партыі і савецкай улады аб 100 проц. і сваечасовым засеве палёў выканаем па-бальшавіцку.

Колгасьнікі.

АЧЫСТКУ НАСЕНЬНЯ ПРАВАЛЬВАЮЦЬ

Жальвінецкі сельсавет Глускага раёну толькі нядаўна атрымаў зернаачышчальныя машыны. Несваечасовае атрыманьне машын пагражае зрыву ачысткі насеньня. Але і за гэты час яшчэ можна было-б значна падагнаць работу.

Што-ж ёсьць на самай справе.

Трыеры, пастаўленыя ў вёсцы Жалвінец для ачысткі, больш стаяць без нагрузкі. Колгасьнікі бязьдзейнічаюць. Комсамольская ячэйка ня толькі не рэагуе на гэта, а наадварот, самі комсамольцы, працуючы з трыерам, да работы адносяцца нядбайна, тады як іншым вёскам прыходзіцца чакаць на трыер.


Хутка пачнецца сяўба. Колгасьнікі выедуць у поле з неачышчаным насеньнем.

Неналаджанасьць, неорганізаванасьць ачышчальнага абозу ставіць пад вялікую пагрозу ачыстку насеньня і сваечасовасьць выхаду к севу.

Жалвінецкаму сельсавету, партыйнай і комсамольскай ячэйкам трэба чым найхутчэй організаваць як ачыстку насеньня, так і ўсе галіны работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Я. ЦАРЫК.

Да вясновай сяўбы ў савгасе „Гігант"



На здымку: дастаўка насеньня на вучасткі для севу

Падрыхтоўку на поўны ход

Халоблінская ячэйка КСМ *пры школе сялянскай моладзі,* Чэркаўскага *раёну Магілеўшчыны сваечасова прыступіла да падрыхтоўкі сяўбы ў колгасах.*

Усе комсамольцы і вучні разьбіліся на 9 ударных брыгад, якія працуюць па вёсках. Для працы кожнай брыгады складзен конкрэтны плян, які ахоплівае ўсе галіны работы па падрыхтоўцы да сяўбы.

Пры 4-х аддзяленьнях колгасу „Чырвоны Пуцілавец", а менавіта, пры: Бліжнярэчыцкім, Новахалоблінскім, Старахалоблінскім, Балванаўскім утвораны політ. і аграгурткі, якія распачалі сваю працу. Колгасьнікі амаль поўнасьцю ахоплены работай гурткоў.

Юраў.

Да сяўбы падрыхтаваны

Комуна „Чырвоны Сьцяг" Койданаўскага раёну ў гэтым годзе пашырылася. Да яе далучыліся в.в. Хомічы, Гаеўка і Чырвоная Горка.

Да падрыхтоўкі к сяўбе ў комуне распачата работа месяц таму назад. Зараз падрыхтоўка амаль скончана.

Комунараўская кузьня адрамантавала 40 плугоў, 15 параконных фурманак, адрамантаваны сеялкі, дыскавыя бораны, нарыхтавана ўгнаеньня 2 вагоны і ачышчана насеньне. Акрамя таго, комунай праводзілася падрыхтоўчая праца да сяўбы ў суседніх вёсках.

Рабочая сіла комуны разьмеркавана па брыгадах.

У комуне уся жывёла, як рабочая, так продукцыйная абагулены за выключэньнем дробнай жывёлы. З вёсак, якія ў гэтым годзе ўліліся ў комуну, лепш за ўсё абстаіць справа ў Хомічах. Там зараз сумесна з комунаю організаваны майстэрні шорная і сталярная, дзе рамантуецца вупраж, транспарт і інш. Комуна зараз зьяўляецца прыкладам для астатніх вёсак. Комунары добра разгарнулі работу з батрацтвам і беднатою.

Комуна зараз мае жывёлагадоўчы напрамак. Гэта ставіць перад комунаю задачу забясьпечаньня адпаведнай кармавой базай у прыватнасьці пашырыць засеў травасеяньня (вызначана 100 г.), але тут супраціўляецца Райпалеводсаюз. Старшыня яго т. Мялешка, калі да яго зьвярнуліся аб забясьпечаньні комуны насеньнем канюшыны, якой не хапае ў комуне, апошні заявіў:—што дае толькі насеньне пад контрактацыю. Такім чынам, па яго выходзіць, што ўвесь клін патрэбна закантрактаваць пад насеньне, а жывёлу карміць не яго справа. Бязумоўна, гэтыя развжаньні галавацяпскія. РВК павінен паклапаціцца, каб забясьпечыць комуну насеньнем конюшыны, бо комуна будзе пазбаўлена корму для жывёлы, якое будзе 500 галоў.

Зараз комунаўская ячэйка КП(б)Б і КСМ праводзіць даволі значную работу па замацаваньню дасягненьняў у галіне колектывізацыі. Організоўваюцца брыгады ў далучаных да камуны вёсках, вядзецца шырокая выхаваўчая работа.

К. Макарэвіч.

Новыя комбайны ў савгасе „Гігант"



На здымку: зборка ў савгасе новага комбайна з ліку атрыманых гэтай вясной 250 штук.

Колгас да сяўбы не падрыхтаваны

У былой вёсцы Мацкевічы, Лешнянскага сельсавету Капыльшчына організаваўся колгас „Прогрэс", які ахапляе 120 гаспадарак.

Абагуленьне насеньня прайшло добра. Увесь насенны фонд абагулены, але не ачышчаны. З абагуленьнем інвэнтара справа абстаіць дрэнна. Інвэнтара не хапае. Стары інвэнтар патрабуе рамонту. Яго ніхто не рамантуе.

Праўленьне колгасу бязьдзейнічае. Напрыклад, член праўленьня Сямашка замест новага плуга здаў у колгас паламаны. Ёсьць яшчэ і шэраг іншых прычын, якія тармозяць падрыхтоўку колгасу да сяўбы.

Кулакі і кулацкія падпявалы адыгрываюцца на гэтым становішчы, і ім ніхто не дае адпору.

Неабходна прыняць усе захады да замацаваньня організаванага колгасу і падрыхтоўкі яго к сяўбе, вядучы рашучую барацьбу з варожымі элемэнтамі.

Я. Кар.

Вопыт Варанцэвіцкай ячэйкі ЛКСМБ

Аб аднэй ячэйцы*)

Вузлавое пытаньне—колгаснае будаўніцтва

— Зрабіць рэволюцыю ў вёсцы —гэта ня лёгкая штука",—казала комсамолка Бельчык М. Але комсамольцы ня нылі, будучы ўпэўнены ў свае сілы, яны разгарнулі шырокую растлумачальную работу сярод беднаты і батрацтва аб сутнасьці і важнасьці колгаснага будаўніцтва.

У вёсцы праводзяцца сыстэматычна батрацка-бядняцкія сходы. Вядзецца адпаведная работа. Комсамольцы прымацаваны асобна да беднаты. З раёну дасталі больш літаратуры аб колгасным будаўніцтве. Навакол організаванай работы і гурткоў пра колектыў організаваўся актыў з сялянства, якое цікавіцца колгасамі.

Кулацтва разьюшылася. Яно пачынае антыколгасную работу сярод сялянства. Склікаюцца падпольныя сходы. Кулакі з Масьцішчаў - Станкевіч, Чаславскі і іншыя шалёна разгортваюць работу, ім дапамагаюць поп і дзяк. Вядзецца шалёная праца з тым, каб разьбіць намечаныя пляны работы па колгасным будаўніцтве.

Ячэйка штодня атрымоўвае ўсё новыя і новыя зьвесткі аб рабоце і плянах кулацтва сярод беднаты і серадняков. Організавана, умела згрупаваўшы свае сілы, комсамольцы разам з батрацка-бядняцкім актывам яшчэ з большым энтузіязмам упарта пачалі весьці растлумачальную работу сярод батрацка-бядняцкага і серадняцкага насельніцтва.

Пачалася жорсткая барацьба за ўплыў на батракоў, беднякоў і серадняков.

За практычнай работай

Сёньня зачынены сход ячэйкі. У парадку дня адно пытаньне:

— Аб організацыі колгасу ў вёсцы Варанцэвічах.

... Сэкратар комсамольскай ячэйкі Шумскі робіць даклад.

— „Самае галоўнае—патрэбна кожнаму комсамольцу практычнай працай сярод насельніцтва паказаць карысьць організацыі колгасаў"—кажа Шумскі.—„Кожны комсамолец павінен першым уступіць у колгас і ўцягнуць сваю сям'ю. Трэба згуртаваць батрацка-бядняцкае ядро па справе практычнай організацыі колгасу. Не дапусьціць у колгас кулацтва і іншы варожы элемэнт".

Комсамольцы на сходзе зрабілі яшчэ большы ўпор на работу сярод батрацтва і беднаты.

— „Адміністрацыйным парадкам колгас не організуеш"—казаў комсамолец Кавалеўскі.

Сход цягнуўся пяць гадзін. У спрэчках выступалі амаль усе комсамольцы, ніякіх хістаньняў.

У пастанове запісана:

„Лічачы пытаньне аб колгасе падрыхтаваным, зараз-жа дамагчыся організацыі колгасу ў вёсцы Варанцэвічах. Правесьці яшчэ адзін папярэдні падрыхтоўчы сход з батрацтвам і беднатою. Усім комсамольцам у першую чаргу запісацца ў колгас і ўцягнуць сваю сям'ю. Кожны комсамолец павінен быць застрэльшчыкам у організацыі колгасу".

Пры зачыненьні сходу партпрымацаваны напомніў комсамольцам:

— „Ну, братва, яшчэ раз запамятайце—работа цяжкая і патрабуе многа політычнай і клясавай сьвядомасьці, ініцыятывы, энтузіязму і бальшавіцкай вытрыманасьці".

— „Нічога... Справімся...

Панесьліся на сцэну ў прэзыдыум гучныя адказы з залі.

Першыя крокі

Яшчэ ад ранку рыхтаваўся Шумскі да сходу. Даклад ужо падрыхтаваны. Былі гатовы і комсамольцы.

Пачаўся сход.

... У хаце супыніўся гоман. Дым махры клубкамі насіўся каля печы і лез у рот.

Парушаючы цішыню звонкім голасам сэкратар ячэйкі Шумскі расказваў сходу пра колгасы.

Усе слухалі... Толькі штохвілінна ўзьнімалася хваля пытаньняў, перабіваючы дакладчыка, але потым зноў станавілася ціха.

— З пытаньнямі колектывізацыі мы спазьняемся, трэба было яшчэ раней організаваць колгас, каб хутчэй пакончыць з тым становішчам, якое на сёньнешні дзень творыць жыцьцё ў нашай вёсцы—працягваў Шумскі,—мы адстаем, нашы бядняцка-серадняцкія гаспадаркі трэба згуртаваць у колгас.

— Праўда, браце,—якой-жа я ліхое долі гаспадар — прагрымеў Паўлюк—цэлы свой век працуеш на гэтай палосцы ды нічога ня выходзіць. Век нічога ня меў і зараз ня маю.

— Дык вось—зазначыў сэкратар Шумскі — толькі тады, як мы організуем колгас-арцель у сваёй вёсцы з далучэньнем хутароў Масьцішча і Новых Варанцэвіч, ды паставім як сьлед работу ў колгасе, выпішам трактар, завернем ім межы, зрабіўшы з вузкіх палосак агульную вялізарную плошчу зямлі; абагулім рабочую жывёлу, насеньне; разьмяркуем сілы; організавана і плянава выступім у паход за соцыялістычную вёску, — вось толькі тады можна палепшыць наша жыцьцё,—скончыў ён.

Шумскі гаварыў многа, падрабязна тлумачыў сходу аб усіх задачах, якія зьвязваюцца з колгасным будаўніцтвам.

— Хто гэта дзе чуў, каб пры цяперашнім сьвеце, ды было добра ў колектыве, калі і ў аднэй сям'і трудна пражыць бяз сварак, а ў вашым колектыве патыліцы будуць трашчаць,—абрушыўся Лычкоўскі.

Цішыня сходу пачала парушацца. Кожны высоўваў пытаньні, хвалюючыя кожнага па свойму. Кожны хацеў выказаць сваю думку наконт колгасу.

— Ціха! Ціха!—пачаў крычаць Бельчык, стоячы каля парогу,—дай мне слова!—Дурні вы ўсе,—працягваў Бельчык,—што вы разумееце? Цьфу на вас! Самі ня ведаеце чаго хочаце. Справа нялёгкая і немагчымая, бо ў нас гаспадаркі няроўныя, ды адны будуць рабіць, а другія лодарнічаць—дык які-ж гэта будзе колектыў?

— Ты сам дурань і нічога не разумееш, вось—напаў раптоўна на Бельчыка бядняк Каласоўскі.—Галёкае чорт ведае чаго—што-ж і надалей ты будзеш так жыць? Цаволі ўжо таптацца на адным месцы, прышоў час што-небудзь зрабіць. Па мойму дык неабходна організаваць сёньня колектыў—зацьвердзіў Каласоўскі.

Падкулачнікі і кулакі хацелі сарваць сход.

Выступіўшы падкулачнік Сьцяпанаў С. усялякімі спосабамі стараўся давесьці сялянам, што калгас гэта згуба для сялянства, што гэта будзе выгадна для гультаёў, а для добрых гаспадароў будзе дрэнна. Комсамольцы, бедната, батрацтва і лепшая частка серадняков рашучым адпорам адсеклі выступленьні падкулачнікаў. У спрэчках бядняк Каралёў С. заклікаў усіх уступіць у колгас, падтрымоўваючы ініцыятыву комсамольскай ячэйкі. Выступалі і другія. Спрэчкі па пытаньнях організацыі колгасу разгортваліся доўга. Сход праходзіў надзвычайна актыўна. Як казалі комсамольцы,—у іх ня было яшчэ сходу з такой актыўнасьцю батрака, беднаты і серадняков.

... І ўрэшце была прынята пастанова:

„Заслухаўшы даклад аб колектывізацыі, сход сямействаў вёскі Варанцовічы вітае мерапрыемствы партыі, накіраваныя на соцыялістычную перабудову вёскі праз організацыю колгасу. Разам з гэтым пастанаўляе організаваць колгас у вёсцы Варанцовічы.

Статут арцелі прыняты цалкам".

Каля стала стварыўся натоўп... За комсамольцамі батракі і бедната. І потым адзін за адным выводзілі свае прозьвішчы няроўнымі літарамі ў сьпісу серадняки. Запісалася 50 сем'яў. І потым далучыліся да іх яшчэ больш. Зараз у колгасе 285 душ.

... Імкнуліся запісацца і кулакі, аддаючы сваю маемасьць, але тут іх намер не прашоў—кулаком далі адпор.

— У азнаку таго, што колгас організаваны па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі,—кажа комсамолец Настрыца,—трэба колгасу даць назву імя „Комсомольской Правды".

За гэтай прапановай паступае другая.

Паслаць прывітальныя тэлеграмы: газэце „Комсомольская Правда", Аршанскаму АК КП(б/Б і Талочынскаму РК КП(б)Б.

Прапановы прымаюцца аднагалосна.

Выбрана праўленьне колгасу, у якое ўвайшлі тры комсамольцы. Назаўтра ячэйка паведаміла райком комсамолу аб організацыі колгасу, а райком паведамляе РВК наступнай адносінай:

„Пры гэтым накіроўваецца статут Варанцэвіцкага колгасу імя „Комсомольской Правды", організаванага Варанцэвіцкай комсамольскай ячэйкай, для зацьверджаньня.

Дадатак: „Статут з усімі матар'яламі.

Сэкратар РК—Цішуроў".

Я. КРАСУЦКІ

(Працяг будзе)

*) Пач. гл. у № 77.

Тэлеграмы

Забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых у Данцыгу

ДАНЦЫГ, 2. У трох сельска-гаспадарчых акругах тэрыторыі вольнага гораду Данцыгу пачалася пад кіраўніцтвам компартыі забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых. Бастуючыя высоўваюць экономічныя патрабаваньні. Забастоўка мае масавы характар. Ва ўсіх вёсках разьмешчаны вялікія атрады паліцыі.

Міжнародны жаночы дзень у Манголіі



Збор сродкаў на карысьць МОПР'у

ПРОЦЭС „СВУ“

ХАРКАЎ, 3-4. Вярхоўны суд дапрасіў падсудную — пісьменьніцу Старыцкую-Чарняхоўскую. У пэрыяд 1926-29 г. г. яна была членам цэнтру „СВУ“. Яна ажыцьцяўляла сувязь цэнтру «СВУ» з прадстаўнікамі замежнай капіталістычнай дзяржавы. Падсудную дапытвае пракурор тав. Міхайлік. Ён устанаўлівае, што падсудная была старшынёю Пятлюраўскага жаночага саюзу за мяжой і ўдзельнічала на сходзе ўкраінскіх контр рэволюцыйных партый у Варшаве.

Пасьля допыту Чарняхоўскай суд распачаў допыт Пятра Яфрэмава, брата галоўнага абвінавачваемага, акадэміка Яфрэмава. П. Яфрэмаў—заснавальнік Днепрапятроўскай групы „СВУ“ і прафэсар ІНО. Яму было даручана вербаваць членаў „СВУ“ сярод масцовай профэсуры і студэнтаў. Яфрэмаў асабіста завербаваў у «СВУ»—6 чалавек, усяго-ж Днепрапятроўская група налічвала 23 чалавекі. Затым суд дапытвае падсудную Беднаву (настаўніцу), члена «СВУ» і падсуднага Белага—настаўніка. Абодвы абвінавачваемых лічаць сваю мінулую работу злачыннай і контр-рэволюцыйнай. Далей суд дапытвае членаў „СВУ“ профэсара Палтаўскага ІНО Шапоцьцева. Выкладаючы гісторыю ўкраінскай літаратуры, ён сьвядома сеяў анты-савецкія настроі сярод моладзі. Шапоцьцеў прызнае сваю дзейнасьць контр-рэволюцыйнай.

Весткі з Польшчы

Барацьба пілсудчыкаў з соймам

ВАРШАВА, 2. Новы прэм'ер Славэк выступіў на паседжаньні беспартыйнага блёку з прамовай, у якой заявіў, што лёс сойму вырашан. Яго трэба распусьціць таму, што ён пераканаўся ў тым, што дзелавое супрацоўніцтва ўраду за настаяшчым соймам немагчыма. Прамова Славэка ўтварыла ў палітычных колах вялікае ўражаньне. Опозыцыйныя фракцыі раскачваюцца пасьля апошняга свайго паражэньня з вялікай цяжкасьцю, але заяўляюць, аднак, што яны сабралі быццам-бы дастатковую колькасьць галасоў, каб прымусіць прэзыдэнта склікаць надзвычайную сэсію сойму.

Фашысцкі суд „за працай“

ВАРШАВА, 2. Акруговы суд у Слоніме прыгаварыў 8 чалавек, якія абвінавачваліся ў прыналежнасьці да компартыі Заходняй Беларусі да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад 1 да 5 год.

Прыцягнуць да адказнасьці агэнта клясавага ворага

(Ад нашага корэспондэнта)

БАРЫСАЎ, 3. У выніку ад зьвярэлых зьбіваньняў з боку мужа зьвар'яцела колгасьніца—Старадзетка.

Муж Старадзеткі, агорклы п'яніца, у былым гандляр коньмі, ні ў якім разе не жадаў, каб жонка і дзеці ўступалі ў колгас. Але яны яго не паслухалі і з гэтае прычыны Старадзетка сыстэматычна зьбіваў сваю жонку, што і паслужыла ў асноўным прычынай вар'яцтва колгасьніцы Старадзеткі.

Старадзетка выгнаў з хаты голых дзяцей. Ен зьяўляецца антысавецкім элемэнтам і распаўсюджвае усякія паклёпы на комуністычную партыю і колгасьнікаў. У часе раскулачваньня хаваў збожжа і рэчы кулакоў.

Мы патрабуем тэрміновага расьледваньня гэтае ганебнае справы і організацыі паказальнага процэсу над азьвярэлым падкулачнікам Старадзеткам.

Алесь Ліпнёвы.

Старадзетка

Даёш сталоўку!

Дрэнна абстаіць справа з грамадзкім харчаваньнем мястэчку Дукоры. У мястэчку няма сталоўкі, а ёсьць брудна закінутая чайная. Самае большае ў чайной можа харчавецца 15 чалавек.

Працоўныя Дукорскага сельсавету патрабуюць ад Сьмілавіцкага раённага праўленьня спажывецкай коопэрацыі тэрміновага адчыненьня сталоўкі ў Дукорах.

САМАКРЫТЫКАЙ ПРАФІЛЬТРУЕМ ШЭРАГІ КОМСАМОЛУ

Чыстка комсамольцаў ВНУ—ёсьць праверка працаздольнасьці будучых чырвоных спэцыялістых

Звычайныя жарты, ці маладыя рвачы?

Бюро колектыву Політэхнікуму справе падрыхтоўкі да чысткі аддало шмат увагі. Перш за ўсё ўсе нашы насьценгазэты (іх у нас тры) організавалі ў сябе куткі праверкі комсамольцаў. Выпушчан спэцыяльны лісток да чысткі пад пунктам погляду „Каго мы выпускаем“, які падрабязна разьбіраўся на ўсіх комсамольскіх ячэйках. На кожнага комсамольца-выпускніка складзена падрабязная характарыстыка, кожнага ацанілі па заслугах. Наогул можна лічыць, што падрыхтоўчая праца праведзена здавальняюча.

Першы вечар праверкі, ня глядзячы на кароткі час, даў належныя вынікі. Выявілася сямейнасьць і кругавая парука на адным з лепшых да гэтага часу курсаў. Справа вось у чым: выпускному курсу будаўнічага аддзяленьня па разьвёрстцы Наркампрацы было прадастаўлена 9 месц на пасаду тэхнікаў-будаўнікоў у Белсельбуд. Зараз-жа сярод студэнтаў гэтага курсу, і як гэта ні шкада—асабліва сярод комсамольцаў, пашлі калідорныя размовы аб тым, што мы, моў, вясковае будаўніцтва „перарасьлі“, што не для гэтага нас рыхтавалі 4 гады, каб мы пашлі ў якійсьці там колгас будаваць сьвінарнікі, куратнікі... Мы ўмеем будаваць буйныя пабудовы гарадзкога тыпу, а не колгасныя канюшні.

Размовы расьлі і шырыліся. Комсамольцы пачыналі, беспартыйныя падпявалі і так ішло...

На гэты цяжкі, як яго характарызавалі, выпадак бюро ячэйкі рэагавала, зрабіла належныя вынікі. У гэтым выпадку цікавы наступныя бакі. Перш за ўсё, гэтае здарэньне адбылося на адным з важнейшых курсаў, па-другое—яно зьяўляецца яркім прыкладам выступленьня супроць політыкі партыі па калгаснаму будаўніцтву, або неразуменьнем гэтай політыкі, дзякуючы чаму усе комсамольцы курсу характарызавалі гэты выпадак як самыя звычайныя „жарты“ і ўсе яны ў ліку 13 асоб на пасяджэньні бюро выступалі „адзін за ўсіх і ўсе за аднаго“.

Праверачнай тройцы неабходна з гэтага выпадку зрабіць адпаведныя вывады.

СЕНКЕВІЧ Я.

Прыцягнуць комсамольцаў вытворчых колектываў

„Лёгкай кавалерыяй“ пэдфаку быў зроблен „налёт“ з мэтай праверкі, як ідзе падрыхтоўка да чысткі і праверкі комсамольцаў выпускнікоў пэдфаку. Выяўлена наступнае: з боку бюро ячэйкі факультэту своечасова было пастаўлена пытаньне аб чыстцы на бюро ячэйкі, дзе прысутнічаў актыў ячэйкі сумесна з студкорамі і „Лёгкай Кавалерыяй“. Пастаўленыя пытаньні дасканальна абгаварылі. Была інформацыя на агульна-факультэцкім сходзе ячэйкі, дзе прысутнічала беспартыйная моладзь.

На курсах праводзіцца прапрацоўка інструкцый па чыстцы сумесна з усімі студэнтамі, прапрацоўка інструкцыі па аддзяленьнях і курсах канчаецца 7-га. Вывешаны па факультэце лёзунгі, а таксама і сьпісы праходзячых чыстку. Грамадзкая думка вакол чысткі складзена.

Пытаньне аб прыцягненьні да чысткі сатаварыскіх комсамольскіх вытворчых колектываў пастаўлена недастаткова.

В. Кучароў.

ТАКІМ НЯ МЕСЦА У НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

У Мазырскім пэдтэхнікуме вучыцца шмат варожых нам элемэнтаў, вось яны: **Кісялевіч**—студэнт ІУ клясы, сын кулака. Праўда, бацька яго нейкім чынам пралез у колгас, усе аб гэтым ведаюць, але нічога ня робяць. Сам-жа ён—член КСМ, займае лепшае месца ў інтэрнаце. **Таміла**—сын кулака, студэнт ІУ курсу, **Казей**—чужы нам чалавек, трымае сувязь з контр-рэволюцыйнай тамажнай цёткай, студэнт П курсу, сын заможніка, **Малашэнка**—сын заможніка, бацька плоціць 56 руб. падатку, і на дзіва, ён атрымлівае поўную стыпэндыю, жыве ў лепшым інтэрнаце. **Шапіра М.** і **Шапіра Д.**—дзеці буйнага лесапрамыслоўцы, гэты элемэнт знаходзіць сабе месца ў тэхнікуме, карыстаецца лепшымі месцамі ў інтэрнаце. **Цышкевіч**—сын кулака. **Таншчанюк**—была калісьці выключана з тэхнікуму, як варожы нам элемэнт, але зараз вучыцца на Ш курсе. **Сякач**—чужы нам элемэнт, бацька быў індывідуальна абкладзены. **Кулажэнка**—папоўскі пабрацімца, уцёк з гомельскага пэдтэхнікуму, цяпер знашоў сабе месца ў мазырскім тэхнікуме. Акрамя гэтага, некаторыя з іх маюць па разьмеркаваньню фабкому платную працу. Яны—актывістыя, у іх у кожнага ашчадная кніжка, а батракі-студэнты ходзяць бяз вопраткі і гэта нікога не датычыцца. Патрэбна ачысьціць нашы шэрагі ад чужых нам людзей.

Трубка.

Паштовая скрынка

Кліцуку—„Ня вытрымалі політэкзаміну“, Рахміле—„Аб Мсьціцкай ячэйцы“, Юнкору П.—„Тэмпы культурнага будаўніцтва адстаюць“. Грыню Апанасу—„Партасьвета ідзе дрэнна“, Біруля Стасю—„Як глядзіць ячэйка комсамолу на піонэрскую працу“, Замхаву—„Пра комсамольца Ісачэнка“, Прымайлу—„Галавацяпы і трохмесячнік“, Пчолцы—„Бюро перастала працаваць“. К. Каралю—„Пастанова адно, а справа другое“, Псэўданіму—„Аб тым, што сярод моладзі не вядзецца ніякай работы“, Траперу—„Бюро Кручанскай ячэйкі паставіла на від“, Букчын—„Трэба іх сьцішыць“. Дубок—„Рвачу падкулачніку ня месца“, Пчолцы—„Сымулянт“, Колесьніку—Такім ня месца ў колгасе“, Пеўню—„Колгас „Іскра“,—ня пойдуць, мы атрымліваем шмат агульных матар'ялаў і ўсе іх зьмясьціць не маем магчымасьці, пішыце нам, як колгасы рыхтуюцца і падрыхтаваны да сяўбы? Абагульваньне і падрыхтоўка сельска-гаспададарчага інвэнтару, організацыя конна-цягавай сілы і стварэньне кармавой базы? Ці складзены вытворчыя пляны ў колгасе, і ці ведаюць аб іх колгасьнікі? Аб працы з батрацтва і беднатой у колгасе? Культурна бытавым будаўніцтвам колгасу, і як ва ўсіх гэтых пытаньнях удзельнічае комсамольская ячэйка?

Кудзатаму—„Настаўніцтва зьвярні ўвагу“, Краско—„Мы вось падрыхтаваны“, Астапенка—„За растлумачэньне лініі партыі“, Елісееву—„У галіне ліквідацыі маем дасягненьні“, Шыпільевічу—„Бярэце прыклад“, Унук Васелеву—„Радыёмаўчацель“, Пралеоку Міхасю—„Аб лодцы ні гу-гу“, Драздоўскаму—„Установілі гучна-маўчацель“, Манарычу—„Парашыві выканаць“, і „Лікпункт не працуе“, Зоркаму—„Пабудуем ... ку“, Кубраkову—„Аб пра... дзеньні кастрычнікай організацыі ... фэрэнцыі“, Адаму Паваротнаму—„... варылі, гаварылі і заціхлі“, Юнкору „Хто наладзіць працу“ Вяскору—„... пабудову лодкі“, Лявонаву—„Ду... ская комсамолія“, Смарадзінскаму „Ячэйка сьпіць“, Піонэру—„Комсамольцы не працуюць“, Гаўрычэнку Мяркуль—„Попыт менскіх вагон... майстэрняў“, Пчолцы—„Ячэйка і жыцьцё“, Колкаму—„Імя ім шкурнікі“, ...лабу—„Годзе спаць пара прачнуцца“, Я. М. Ж—ка—„Нічога ня ... біцца з політ-кампаніяй“, Басьн... „Патрэбна больш працы сярод моладзі“, „Ячэйкі не распачалі“, „Зьні... ецца няпісьменнасьць“, Я з Б... „Ажыцьцявіць сярод піонэраў пра... І. Папкову—„Як Жэрынская ячэйка прасьвяшчае моладзь“ і „Што ігрышчы дзеецца“, У. К.—„Чыстка адбывалася“, Камару—„Вучоба пр... лена“, Крынічнаму—„Праца занята... Ліст з Полацку—„Людзі, занятыя к... паніяй“ Фабкому шпалернай фабрыкі Менск—„Аб вечары, прысьвечаным трохмесячніку“, Сьцяпанаву—„Аб трохмесячніку ні гу-гу“, Вучню—„Ня ... чыць, а мучыць“, Матлюку—„Беларускую Дзяржаўную Капэлю трэба а... равіць“,—пералічаныя допісы друкавацца ня будуць. Частка з іх ма... дробязныя факты, а большасьць м... на скарыстаць на месцы для насьценных газэт.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599